ВЕСЦІ НАЦЫЯНАЛЬНАЙ АКАДЭМІІ НАВУК БЕЛАРУСІ № 2 2015
СЕРЫЯ ГУМАНІТАРНЫХ НАВУК

## *МАСТАЦТВАЗНАЎСТВА, ЭТНАГРАФІЯ, ФАЛЬКЛОР*

*УДК 75.046.03(476)«17/18»*

*Г. А. ФЛІКОП*

# УПАМІНАННІ ПРА СПІСЫ МАЛАВЯДОМЫХ ЦУДАДЗЕЙНЫХ АБРАЗОЎ У АПІСАННЯХ УНІЯЦКІХ ХРАМАЎ XVIII – ПАЧАТКУ XIX ст.

*Цэнтр даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры НАН Беларусі*

*(Паступіў у рэдакцыю 02.12.2014)*

Да пытання іканаграфіі цудадзейных абразоў мы ў нашых ранейшых працах звярталіся неаднаразова. На гэтую тэму беларускімі і замежнымі навукоўцамі апублікавана даволі шмат артыкулаў і кніг [16]. Разам з тым азначаная праблематыка працягвае прывабліваць даследчыкаў сакральнай культуры шэрагам нераспрацаваных пытанняў, якія патрабуюць вывучэння. Да іх ліку належыць і такі аспект, як іканаграфія малавядомых цудадзейных абразоў.

Справа ў тым, што лёс шматлікіх святыняў складаўся такім чынам, што яны або не дайшлі да нашага часу, або некалі шанаваныя абразы, якія служылі выяўленчай першакрыніцай для іншых твораў і паўплывалі на ўзнікненне новых зводаў, па тых ці іншых прычынах перасталі збіраць да сябе вернікаў, іх культ як цудадзейных згас і яны апынуліся ў забыцці. Найлепш у такім выпадку сітуацыя склалася для тых ікон, з якіх былі зроблены шматлікія спісы: наяўнасць некалькіх помнікаў аднолькавай іканаграфіі адразу ж наводзіць на думку пра існаванне агульнай для іх першакрыніцы, і тады задача навукоўцаў зводзіцца да яе ўстанаўлення.

Аднак існуюць і іншыя выпадкі: з гістарычных крыніц вядома пра пэўны цудадзейны абраз, вядома нават і тое, што з яго былі выкананы спісы для іншых храмаў, аднак ні першакрыніца, ні яго паўторы не дайшлі да нашага часу. Страта артэфактаў прыводзіць да забыцця пра існаванне некалі шануемых святыняў. Таму згадкі ў старажытных дакументах пра выявы, напрыклад, «Божай Маці Барысаўскай»[1], выклікаюць, з аднаго боку, здзіўленне, а з другога – жаданне высветліць гісторыю страчанага помніка, вызначыць яго іканаграфію.

Як адзначана ў назве, у дадзеным артыкуле гаворка будзе ісці пра спісы цудадзейных абразоў. Спіс – гэта аўтарскі паўтор, варыянт[2]. Яны могуць адрозніваццa каларытам, пэўнымі дэталямі і іншымі рысамі ад першаўзору. Менавіта спісы ў большасці выпадкаў захавалі для нас звесткі пра выгляд страчанай святыні. Паколькі шматлікія цудадзейныя абразы зніклі або былі знішчаны ў савецкі перыяд, то ўяўленне пра іх іканаграфію даюць іх мастацкія паўторы, якіх, як правіла, было даволі шмат, а таму хаця б некалькі з іх дайшло да нашага часу[3] [16].

[1] Цудадзейныя абразы атрымлівалі сваё найменне ад месцазнаходжання: «Божая Маці Жыровіцкая» – у в. Жыровічы на Слонімшчыне, «Божая Маці Барунская» – у в. Баруны на Ашмяншчыне, «Божая Маці Будслаўская» – в. Будслаў на Мядзельшчыне, «Божая Маці Вастрабрамская» – у Вострай Браме г. Вільні і г. д. Спісы цудадзейных абразоў маюць такую ж назву, як і іх пратограф.

[2] У старажытнай сакральнай культуры было распаўсюджана меркаванне пра тое, што копія, зробленая з цудадзейнага абраза, будзе валодаць той жа магутнай сілай, што і першакрыніца. Таму з «ласкавых» ікон «спісвалі» (г. зн. перамалёўвалі) выяву, ствараючы абразы для іншых храмаў. Адсюль і пайшоў тэрмін – «спіс». Часам у асветніцкіх выданнях, прызначаных для шырокай аўдыторыі (а не для вузкіх спецыялістаў), выкарыстоўваецца больш зразумелы тэрмін – копія. Аднак гэтыя паняцці нельга назваць сінонімамі, бо спісы, як правіла, не перадаюць з дакладнасцю ўсе асаблівасці першаўзору.

[3] Прыкладам можа служыць абраз «Божай Маці Бялыніцкай»: пад час вайны славуты першаўзор быў вывезены з музея ў г. Магілёве, дзе захоўваўся (не захавалася нават яго фотаздымкаў), аднак уяўленне пра яго выгляд даюць спісы, якія прынята называць гэтаксама – «Божая Маці Бялыніцкая».

У дадзеным артыкуле гаворка будзе ісці пра спісы, якія знаходзіліся ва ўніяцкіх храмах Беларусі, што зафіксавана ў гістарычных крыніцах, зробленыя з малавядомых цудадзейных абразоў. Інакш кажучы, даследаваннем будуць ахоплены толькі тыя выявы, якія на цяперашні час з'яўляюцца забытымі, а іх іканаграфія – не ўстаноўленай. Сведчыць пра існаванне такіх святыняў тое, што некалі з іх былі зроблены спісы для ўніяцкіх храмаў Беларусі, і пад час праверак гэтых бажніц у дакументах былі зафіксаваны адпаведныя найменні.

Звернем увагу на такія помнікі, а дакладней, спісы з іх, якія бытавалі ва ўніяцкіх храмах Беларусі. У тагачасных апісаннях грэка-каталіцкіх цэркваў часам акрамя вядомых іконаграфічных зводаў[4] згадваюцца і рэдкія найменні «Божая Маці Хвашчоўская», «Божая Маці Кубліцкая», «Божая Маці Барысаўская», «Божая Маці Ушацкая», «Божая Маці Ванюжыцкая».

У дадзеным выпадку гаворка ідзе пра спісы цудадзейных абразоў, аднак пра існаванне ў Хвашчоўцы (Фашчоўцы), Кублічах, Барысаве, Ушачах, Ванюжычах ікон, якія шанаваліся як «ласкавыя», ніякіх звестак у сучаснай літаратуры няма. Больш за тое, культ іх у нейкі перыяд заняпаў, абразы, верагодна, зніклі ў часы войнаў XX ст. ці былі знішчаны ў часы савецкай атэістычнай кампаніі. Такім чынам, устанаўленне таго, што сабой уяўлялі дадзеныя іконы, якія яны мелі іконаграфічныя асаблівасці, і з'яўляецца задачай дадзенага даследавання.

Спынімся больш падрабязна на кожным з пералічаных іконаграфічных зводаў. Пачнем разгляд з «Божай Маці Ушацкай». Менавіта такое найменне фігуруе ў апісанні аднаго з бакавых алтароў уніяцкай царквы Яна Евангеліста в. Міхалеў Рагачоўскага дэканата ў 1792 г. [8, арк. 2–2 адв.]. Абраз «Божай Маці Ушацкай» быў аздоблены дзвюма срэбнымі каронамі і вотамі. Трэба адзначыць, што ў гістарычных крыніцах гэта адзінае згадванне, якое нам сустрэлася пра дадзены іконаграфічны звод. У больш ранніх і больш позніх апісаннях царквы ў в. Міхалеў упамінанняў пра яе няма.

Так, у дакуменце за 1784 г. (названы храм тады ўваходзіў ў склад Бабруйскага грэка-каталіцкага дэканата) адзначаецца толькі пра галоўны алтар з абразом Божай Маці і пра два абразы (выявы не зафіксаваны), змешчаныя побач з ім на сценах [4, арк. 44]. Верагодна, у той час бакавых алтароў яшчэ не было. На жаль, не вядома, якія сюжэты былі прадстаўлены на гэтых творах. Магчыма, адзін з абразоў і ўяўляў «Божую Маці Ушацкую», аднак цалкам верагодна, што гэтая выява была напісана пазней: наўмысна для створаных бакавых алтароў. У гэтым выпадку можна выказаць меркаванне, што абраз «Божай Маці Ушацкай» быў выкананы паміж 1784 і 1792 гг.

Пазней, у 1819 г. Міхалеўская царква, пасля непрацяглага знаходжання ў складзе Рагачоўскага дэканата, зноў фігуруе ў пераліку цэркваў Бабруйскага дэканата [5, арк. 355–356]. У названым годзе пры яе апісанні абраз «Божай Маці Ушацкай» не згадваецца. Магчыма, ён працягваў знаходзіцца ў царкве, паколькі пры яе апісанні адзначаюцца толькі тытульныя абразы ў алтарах: выявы тых святых, у гонар якіх асвечаны алтары. Пры гэтым падкрэсліваецца, што маюцца і іншыя абразы, сюжэты якіх не названы. Верагодна, што сярод іх і быў разглядаемы намі твор.

У 1828 г. зноў жа пры апісанні Міхалеўскага храма згадваюцца толькі выявы ў алтарах. Аднак на гэты раз адносна левага алтара адзначаецца, што ў ім дзве выявы: Яна і Божай Маці. Другі з іх мае дзве срэбныя кароны і воты [6, арк. 110]. Менавіта так і быў апісаны адзін з бакавых алтароў у 1792 г. Праўда, тады было зроблена ўдакладненне адносна выявы Божай Маці. Зараз жа яно адсутнічае, аднак відавочна, што гэта ўсё той жа твор. Такім чынам, ва ўніяцкай царкве в. Міхалеў з 1792 (а можа і раней) па 1828 г. (магчыма, і пазней) знаходзіўся абраз «Божай Маці Ушацкай».

Дадзены абраз з'яўляўся спісам цудадзенай іконы, якая знаходзілася ва Ушачах, адкуль святыня і атрымала сваю назву – «Ушацкая». Заставалася толькі адшукаць інфармацыю пра славуты «ласкамі» твор, які знаходзіўся ў беларускім паселішчы з такой назвай.

Мястэчка Ушачы з'яўляецца даволі вядомым населеным пунктам, а не дробнай вёсачкай, якая і на карты магла б не патрапіць. Таму нескладана было вызначыць месца бытавання цудадзейнага абраза – гістарычная Полаччына, а цяпер – Ушацкі раён Віцебскай вобласці. У мястэчку было некалькі храмаў розных хрысціянскіх канфесій. Аднак цікава, што ў шматлікіх рускіх царкоўна-гістарычных выданнях канца XIX – пачатку XX ст., дзе апісваюцца і цудадзейныя абразы нашых зямель, згадак пра «Божую Маці Ушацкую» няма [1].

---

[4] Такіх, як «Божая Маці Чанстахоўская», «Жыровіцкая», «Бялыніцкая», «Вастрабрамская», «Пачаеўская», «Будслаўская», «Барунская» і інш.

Гэтаму можа быць толькі два тлумачэнні: 1) у названым мястэчку не было цудадзейнай іконы; 2) ва Ушачах быў «ласкавы» абраз, аднак ён не шанаваўся праваслаўнымі (у рускіх выданнях асвятліліся менавіта праваслаўныя святыні). Відавочна, што больш абгрунтаванай з'яўляецца другая версія. Гэта наводзіць на думку пра тое, што цудадзейны абраз ва Ушачах знаходзіўся ў каталіцкім касцёле. Справа ў тым, што ён мог бы першапачаткова знаходзіцца і ва ўніяцкай царкве, але пасля скасавання канфесіі на нашых землях у 1839 г. храмы былі пераасвечаны ў праваслаўе, і культ цудадзейных абразоў не згас. Менавіта яны, ранейшыя ўніяцкія святыні, і сталі шанавацца праваслаўнымі вернікамі, а таму і патрапілі ў рускія царкоўныя выданні. Паколькі ўшацкая «Багародзіца» не згадваецца ні ў адным з іх, то, верагодна, яна знаходзілася ў касцёле і шанавалася каталіцкімі вернікамі.

Гэтая акалічнасць навяла на пэўны след: інфармацыю пра такую святыню трэба шукаць у працах польскіх даследчыкаў. Менавіта палякі ў сваіх гісторыка-рэлігійных выданнях асвятлялі гісторыю не толькі «сваіх» цудадзейных абразоў, але і тых, што знаходзіліся на беларускіх землях у лацінскіх храмах. Так, у чатырохтомнай працы «Гісторыя цудадзейных абразоў Божай Маці ў Польшчы», выдадзенай у пачатку XX ст., прыводзіцца расповед і пра ўшацкую святыню, якая знаходзілася ў касцёле кляштара дамініканцаў. Акрамя таго, што немалаважна, там змешчаны фотаздымак выявы [18, с. 50–54]. Ён сведчыць пра тое, што абраз «Божай Маці Ушацкай» з'яўляецца шматфігурнай кампазіцыяй і належыць да тыпу «Божая Маці Ружанцовая». Там прадстаўлена Багародзіца ў поўны рост, якая на левай руцэ трымае маленькага Ісуса, а перад імі ўкленчаны мужчына і жанчына ў вопратках манахаў-дамініканцаў. З апісання, прыведзенага аўтарам, вынікае, што гэта – Святыя Дамінік і Кацярына Сіенская. Аднак, на нашую думку, на абразах такога сюжэта змешчана не Кацярына Сіенская, а Роза Лімская.

Так ці інакш, але сама выява аказалася нечаканай. Справа ў тым, што ў гістарычных дакументах пры апісанні храма ў в. Міхалеў, дзе знаходзіўся спіс з цудадзейнага ўшацкага абраза, нідзе не было зафіксавана, што ён прадстаўляе «Божую Маці Ружанцовую». Безумоўна, такое ўдакладненне ў архіўных крыніцах рабілася не заўсёды, аднак даволі часта пры апісанні ікон у іншых храмах і быў адзначаны тып выявы «Ружанцовая».

Пэўнае святло на ўсю гэтую сітуацыю з цудадзейным абразом пралівае невялікая прыпіска пасля прыведзенай у польскай кнізе гісторыі святыні з ушацкага касцёла. У ёй адзначаецца: «Верш пра Найсвяцейшую Панну пад назвай "Найдаражэйшай Божай Маці Ушацкай… радасць, выказаная рытмам", апублікаваны ў 1683–1693 гг., датычыцца іншага абраза, які знаходзіўся раней у тым жа мястэчку ва ўніяцкай царкве айцоў-базыльянаў» [18, с. 54]. Адсюль вынікае, што ва Ушачах два абразы шанаваліся як цудадзейныя: адзін – у каталіцкім храме, другі – ва ўніяцкім[5].

Відавочна, што абраз «Божай Маці Ушацкай», які знаходзіўся ў Міхалеўскай уніяцкай царкве, з'яўляецца спісам менавіта з другога з названых. Гісторыя і іканаграфія яго, на жаль, невядомыя. Аднак з прыведзеных вышэй звестак вынікае, што ў канцы XVII ст. ён ужо шанаваўся як цудадзейны, бо пра яго складалі вершы.

У архіўных крыніцах удалося адшукаць пацвярджэнне таму, што ў кляштарнай базыльянскай царкве ва Ушачах сапраўды знаходзілася «ласкавая» ікона. Так, у апісанні галоўнага алтара бажніцы за 1808, 1813 і 1819 гг. фігуруе цудадзейны абраз Багародзіцы [11, арк. 48; 12, арк. 1 адв. – 2; 13, арк. 1 адв. – 3 адв.]. Пра яго іканаграфію ніякіх звестак не прыведзена, аднак адзначаецца, што над галовамі Божай Маці і Хрыста былі залатыя кароны, таксама пералічваюцца шматлікія воты і, што цікава, згадваецца тэхніка: выява напісана на бляхе. Іншыя помнікі, створаныя на такой аснове, маюць, як правіла, невялікія памеры. Верагодна, такой жа была і цудадзейная «Божая Маці Ушацкая».

Недалёка ад Ушачаў знаходзілася яшчэ адно паселішча з «ласкавай» іконай – Кублічы. На цяперашні час пра жывапісную святыню звестак амаль не захавалася. Зноў жа, як і ў папярэднім выпадку, у рускіх царкоўных выданнях, якія на нашых землях у XIX ст. з'яўляліся важным

---

[5] Па якой прычыне і ў які час культ святыні з базыльянскага кляштара заняпаў – невядома. Па ўсёй верагоднасці, гэта адбылося пасля скасавання грэка-каталіцкай канфесіі ў Расійскай імперыі і закрыцця кляштара. У 1860-я гг. базыльянская царква, відавочна, была перабудавана ў праваслаўную, якая ў часы Другой сусветнай вайны была зруйнавана, а пазней на гэтым месцы пабудавалі раённы дом культуры.

папулярызатарскім сродкам, інфармацыі пра яе няма ўвогуле. Тлумачэнне ў дадзенай сітуацыі простае: цудадзейны абраз «Божай Маці Кубліцкай» знаходзіўся ў касцёле.

На жаль, да цяперашняга часу не дайшла ні сама святыня, ні яе фотаздымкі. Можа, і захаваліся спісы з яе, аднак немагчыма акрэсліць прыналежнасць такіх твораў да пэўнага іконаграфічнага зводу.

Дакладна вядома, што ў адным з уніяцкіх храмаў у 1764 г. знаходзіўся абраз такой іканаграфіі. Гэта датычыцца царквы ў в. Быча Рагачоўскага дэканата. З апісання бажніцы вынікае, што «Божая Маці Кубліцкая» знаходзілася ў галоўным (ён быў адзіным) алтары [7, арк. 31 адв.]. Акрамя яе, іншыя выявы ў царкве не згадваюцца. Не ўдалося нам выявіць і больш позні дакументы з апісаннемназванага храма. У пратаколах праверак Рагачоўскага дэканата за 1784, 1822 гг. ён не згадваецца [4; 15]. У апісаннях іншых суседніх царкоўна-адміністрацыйных адзінак, куды капліца магла быць далучана, пры пераліку храмаў яна таксама не прыводзіцца. Таму, на жаль, невядомы далейшы лёс гэтага абраза. Аднак архіўныя матэрыялы дазволілі высветліць, як выглядала цудадзейная ікона «Божай Маці Кубліцкай».

Так, у апісанні галоўнага алтара каталіцкага парафіяльнага касцёла ў в. Кублічы адзначаецца і пра цудадзейны абраз [9, арк. 6–7]. Цікава, што на творы быў прадстаўлены сюжэт «Дабравесце», што з'яўляецца даволі рэдкім, бо часцей «ласкавымі» іконамі з'яўляліся выявы Багародзіцы (а не сюжэтныя). На жаль, з апісання немагчыма зразумець, якія менавіта характэрныя рысы адрознівалі дадзены твор ад аналагічных абразоў такога сюжэта. Таму не ўяўляецца магчымым з усяго шэрага абразоў сюжэта «Дабравесце» адшукаць спісы кубліцкай святыні.

Кубліцкі касцёл, пабудаваны ў 1642 г., пасля ўваходу беларускіх зямель у склад Расійскай імперыі ў 1867 г. быў пераасвечаны ў праваслаўную царкву[6]. Каталікі перад пераасвячэннем усё начынне і цудадзейны абраз перанеслі ў касцёл в. Селішча [17, с. 15]. Як склаўся далейшы лёс святыні – невядома.

Аднак атрыманыя звесткі дазволілі не толькі дакладна ўстанавіць, што ў в. Кублічы знаходзілася «ласкавая» выява, але і даць пэўнае ўяўленне пра яе выгляд. На дадзены момант названы гістарычны дакумент з апісаннем касцёла і яго начыння з'яўляецца адзінай вядомай нам крыніцай, якая ў нейкай ступені прыадкрыла таямніцу кубліцкага цудадзейнага абраза.

Яшчэ адной забытай «ласкавай» іконай, пра існаванне якой, як і ў папярэднім выпадку, вядома па сціплых звестках, з'яўляецца «Божая Маці Хвашчоўская». Спіс з гэтага абраза ў 1822 г. знаходзіўся, пра што сведчаць архіўныя крыніцы, у галоўным алтары царквы Св. Мікалая в. Менічы Бабыніцкага дэканата (Віцебшчына) [14, арк. 84]. У дакуменце не ўказаны ні матэрыял асновы твора, ні накладныя аздобы (шаты, кароны, воты). Як і ў выпадку з «Божай Маці Ушацкай» і «Божай Маці Кубліцкай», звестак пра хвашчоўскую святыню ў рускіх царкоўных выданнях няма, што зноў-такі навяло на думку пра яе каталіцкае паходжанне.

І, сапраўды, у названай вышэй польскай кнізе згадваецца в. Фашчоўка[7] з цудадзейным абразом [18, с. 29–33]. Паселішча знаходзіцца цяпер у Шклоўскім р-не Магілёўскай вобл. У названай польскай кнізе не толькі прыведзены гісторыя твора і яго апісанне, але і змешчаны стары фотаздымак, які дае ўяўленне пра іканаграфію помніка (малюнак)[8]. На жаль, сярод вядомых нам твораў, якія захаваліся па цяперашні час, нам незнаёмы абразы такой іканаграфіі[9]. Нягледзячы на тое, што на дадзены момант не ўдалося адшукаць прыклады гэтага зводу, усё ж ёсць спадзяванне, што яны захаваліся і калісьці будзе ўстаноўлена іх іканаграфія. Каштоўна і тое, што атрымалася знайсці выяву гэтай страчанай святыні. Абраз быў разрабаваны і знішчаны ў чэрвені 1937 г. Пазней, у 1967 г., быў узарваны касцёл [2]. Такім чынам, не захавалася ні шануемая вернікамі святыня, ні бажніца, дзе яна знаходзілася на працягу стагоддзяў.

---

[6] У 1948 г. быў разбураны.

[7] Для беларускай мовы гук [ф] з'яўляецца запазычаным, у старых словах замест яго было спалучэнне гукаў [хв] (раней – *Хведар*, цяпер – *Фёдар*) або гукі [п], [т] (параўн. рус. *Филипп, Фома, Фёкла* і бел. *Піліп, Тамаш, Тэкля*).

[8] На ім прадстаўлена пакаленная выява (што даволі рэдка) Божай Маці, якая на левай руцэ трымае маленькага Хрыста, а ў правай – скіпетр. Ісус у левай руцэ трымае Евангелле, пальцы правай складзены ў благаслаўляльным жэсце. Выява ў цэлым з'яўляецца вельмі характэрнай для тыпу Адзігітрыя. Ніякіх нечаканых рыс няма. Ракурсы персанажаў традыцыйныя – Маці павярнулася да Дзіцяці (а яно – да яе) у тры чвэрці.

[9] Цікава, што на большасці абразоў, на якіх Божая Маці трымае скіпетр, Хрыстос паказаны са сферай, а не з кнігай.



Божая Маці Фашчоўская, страчаны цудадзейны абраз (фотаздымак пачатку XX ст.)

Наступным забытым цудадзейным абразом, разгледжаным намі, з'яўляецца «Божая Маці Барысаўская». У дадзеным выпадку занядбанне адбывалася ўсвядомлена. Справа ў тым, што ў XIX ст. вернікі і каталіцкія святары ў Барысаве перасцерагаліся значна прыцягваць увагу да сваёй святыні, паколькі мясцовы касцёл маглі разам з цудадзейным абразом аддаць праваслаўным або проста перамясціць «ласкавую» ікону ў царкву [18, с. 22]. Таму барысаўскія парафіяне не імкнуліся пашырыць культ сваёй «апякункі». У выніку ў пачатку XX ст. пра «цудадзейнасць» барысаўскага абраза памяталі мясцовыя старажылы, а маладое пакаленне пра гэта нічога не ведала. Які лёс напаткаў жывапісную святыню ў XX ст., невядома.

Адзінае згадванне пра спіс гэтай іконы знаходзіцца ў апісанні ўніяцкай Глівінскай царквы Маці Божай Смуткуючай Барысаўскага дэканата за 1754 г. [10, арк. 7]. Дарэчы трэба адзначыць, што іншых дакументаў па гэтай царкве выявіць не ўдалося. А ў больш позніх візітах гаворка ідзе пра царкву Узвядзення Крыжа ў Глівіне. Яе апісанне таксама сведчыць пра тое, што гэта – іншы будынак, а не пераасвечаны і перайменаваны стары. Магчыма, храм Багародзіцы згарэў ці заняпаў, што ў тыя часы было даволі распаўсюджанай з'явай.

Так ці інакш, але ў 1754 г. у названай царкве знаходзілася адзіная, паводле архіўных звестак, выява «Nayswiętrzey Panny Borysowskiey». На жаль, ніякіх звестак ні пра барысаўскі першаўзор, ні пра спісы з яго ў іншых храмах (акрамя названага прыкладу), ні пра асаблівасці іканаграфіі не захавалася. Аднак дзякуючы архіўным крыніцам стала вядомым, што некалі гэта мела месца ў беларускай культурна-рэлігійная прасторы і айчынным сакральным мастацтве.

Апошні сюжэт, які будзе разгледжаны ў дадзеным артыкуле, датычыцца «Божай Маці Ванюжыцкай». Спіс з названага цудадзейнага абраза знаходзіўся, пра што сведчаць гістарычныя дакументы 1777 г., у царкве Св. Дзмітрыя в. Бяседкі Петрыкаўскага дэканата (Гомельшчына). Пры гэтым цікава, што ў названай крыніцы пры апісанні выявы менавіта і ўказана паходжанне іканаграфіі: «obraz NayS. Maryi Panny z obrazu Waniuzyckiey NayS. M: Panny cydami słynącey kopiowany»[10] (абраз Найсвяцейшай Дзевы Марыі, скапіраваны з абраза Ванюжыцкай Найсвяцейшай Дзевы Марыі, славутага цудамі) [3, арк. 38].

Цікава, што іканаграфічная першакрыніца названага спіса знаходзілася ў той жа мясцовасці і таксама ва ўніяцкай царкве. Так, пры апісанні храма Нараджэння Божай Маці в. Ванюжычы Мазырскага дэканата за 1778 г. адзначаецца, што ў галоўным алтары знаходзіцца цудадзейны абраз Багародзіцы, напісаны на палатне і аздоблены вотамі. Пры гэтым падрабязна пералічваюцца яго цуды[11] [3, арк. 67–68 адв.]. Так, у бажніцы мястэчка Ванюжычы на Мазыршчыне першы цуд ад абраза адбыўся напрыканцы 1760-х гг. – выратаванне збожжа ад нашэсця саранчы. У далейшым перад іконай вернікі атрымлівалі вылячэнне. Гэта выклікала афіцыйнае прызнанне цудадзейнасці ў 1770 г., што ў сваю чаргу паўплывала на пашырэнне культу іконы, з'яўленне спісаў і ўкараненне новай мясцовай іканаграфіі «Маці Божай Ванюжыцкай». Пра гэта сведчыць твор адпаведнай кампазіцыі ў царкве в. Бяседкі. На жаль, на цяперашні час невядомы асаблівасці такой іканаграфіі. Культ цудадзейнага абраза з часам згас. Магчыма, дзесьці і захаваліся спісы, аднак іх прыналежнасць да дадзенага іканаграфічнага зводу не ўстаноўлена.

[10] Тут захавана тагачасная аўтарская арфаграфія і пунктуацыя.

[11] Гэта з'яўляецца даволі рэдкім, бо ў кнігу праверак храма звычайна цуды ад абраза не перапісваліся: яны занатоўваліся ў спецыяльны сшытак, які вёўся святаром царквы.

З разгледжаных у дадзеным артыкуле пяці цудадзейных абразоў толькі для аднаго («Божая Маці Хвашчоўская») удалося высветліць кампазіцыйныя рысы, чаму садзейнічала адшуканне старога фотаздымка з выявай, надрукаванага ў польскім выданні пачатку XX ст. Для астатніх так і не атрымалася ўстанавіць асаблівасці іконаграфічнага зводу. Аднак удалося вызначыць, што «Божая Маці Кубліцкая» – гэта абраз сюжэта «Дабравесце». Цудадзейная «Божая Маці Ушацкая» была напісана на метале.

Прыведзеныя звесткі даюць магчымасць не толькі пашырыць уяўленне пра колішнія цудадзейныя абразы, але і дазваляюць сцвярджаць, што іконы «Божай Маці» былі прадстаўлены не толькі такімі папулярнымі выявамі, як «Жыровіцкая», «Бялыніцкая», «Барунская», але і шматлікімі іншымі, якія па цяперашні час застаюцца нявызначанымі і неўстаноўленымі.

## Літаратура


1. *Булгаков, С. В.* Настольная книга для священно-церковно-священнослужителей / С. В. Булгаков. – М.: Изд. отдел Моск. патриархата, 1913. – 1773 с.
2. *Грудзіна, А.* І ўбачыў руіны касцёла… З гісторыі касцёла ў вёсцы Фашчаўцы / А. Грудзіна // Наша слова. – 2014. – 8 студ. – № 2 (1153). – С. 7.
3. Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі (НГАБ). – Ф. 136. Воп. 1. Спр. 41240.
4. НГАБ. – Ф. 136. Воп. 1. Спр. 41241.
5. НГАБ. – Ф. 136. Воп. 1. Спр. 41256
6. НГАБ. – Ф. 136. Воп. 1. Спр. 41265.
7. НГАБ. – Ф. 136. Воп. 1. Спр. 41278.
8. НГАБ. – Ф. 1245. Воп. 1. Спр. 1.
9. НГАБ. – Ф. 1781. Воп. 26. Спр. 1379.
10. НГАБ. – Ф. 3245. Воп. 8. Спр. 2.
11. НГАБ. – Ф. 3421. Воп. 1. Спр. 1.
12. НГАБ. – Ф. 3421. Воп. 1. Спр. 70.
13. НГАБ. – Ф. 3421. Воп. 1. Спр. 118.
14. Российский государственный исторический архив (РГИА). – Ф. 824. Оп. 2. Д. 178.
15. РГИА. – Ф. 824. Оп. 2. Д. 184.
16. *Флікоп, Г. А.* Беларускія ўніяцкія абразы Божай Маці «невядомай іканаграфіі»: да пытання ўстанаўлення зводу / Г. А. Флікоп // Беларус. гіст. часоп. – 2014. – № 3. – С. 23–37.
17. Białoruski szlak barokowy. Białoruś Północno-Wschodnia na Via Regia / tekst Wojciech Boberski. – 21 s.
18. Historye cudownych obrazów Najświętszej Maryi Panny w Polsce. Tom czwarty obejmujący obrazy archidyecezyi Mohylewskiej, dyecezyi Wileńskiej, Kowieńskiej, Łucko-Żytomirskiej, tudzież Śląska i północnych Węgier / zebrał według autentycznych żródeł ks. Alojzy Fridrich T. J. – Krakow, 1911. – 483 s.


*G. A. FLIKOP*

**MENTIONS ABOUT THE LISTS OF LITTLE-KNOWN WONDER-WORKING ICONS IN DESCRIPTIONS OF UNIAT CHURCHES OF XVIII – BEGINNING XIX CENTURIES**

## Summary


Article deals with the iconography of forgotten and lost wonder-working icons, copies of which existed in the Uniat churches in Belarus in the XVIII – early XIX centuries. It has been evidenced by archival sources.

We are talking now about such forms of them as «The Virgin of Ushachi», «The Virgin of Kublichi», «The Virgin of Fashchevka», «The Virgin of Borisov» and «The Virgin of Vanuzhichi».